263 (прыватныя), адна нямецкая і ніводнай беларускай (НАРБ. Ф. 4. Воп. 21. Сп. 1512. Ар. 21-27).

Пасля забароны польскай адміністрацыяй у канцы 1936 г. дзейнасці дзвюх асноўных культурна-асветніцкіх арганізацый Заходняй Беларусі – Таварыства беларускай школы і Беларускага Інстытута Гаспадаркі і Культуры – супрацьдзеянне паланізацыі працягвалася стыхійна, падпольна. Цягу людзей да ведаў на роднай мове магла часткова задаволіць самаадукацыя. Шмат зрабіў у справе яе прапаганды часопіс "Беларускі летапіс", выдаўцы якога заклікалі ўсе ўцалелыя палітычныя сілы да кансалідацыі. Аднак самаадукацыя не набыла масавага характару. Нешматлікая беларуская інтэлігенцыя усё ж не адмовілася ад самаахвярнай асветніцкай працы, асабліва сярод моладзі. Для гэтага выкарыстоўваліся любыя магчымыя сродкі, найперш друк.

Польскія ўлады у 1939 г. зрабілі чарговыя захады па пашырэнню асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва. Меры па узмацненню "польскага стану валодання" у Навагрудскім ваяводстве прысутнічалі у сакрэтным плане, які быў распрацаваны у красавіку 1939 г. З мноства мерапрыемстваў вылучым наступныя: поўнасцю выключыць з вучэбных планаў школ беларускую мову, перападрыхтаваць усіх настаўнікаў у духу клерыкальных, мілітарысцкіх ідэй, значна абмежаваць доступ да сярэдняй адукацыі дзецям няпольскага насельніцтва і інш. У дакуменце падкрэслівалася, што "польская школа павінна мець ясна паказаную палітычную мэту і адпаведна падрыхтаваны персанал". Узмацнення паланізацыі дамагаўся беластоцкі ваявода Г. Асташэўскі у сакрэтнай дакладной запісцы ад 23 чэрвеня 1939 г. у міністэрства унутранных спраў Польшчы. Ён выступаў за тое, каб беларускае насельніцтва не толькі вучылася па-польску, але і думала "у духу польскай дзяржаўнасці".

## ЭКОНОМИЧЕСКОЕ РАЗВИТИЕ БРЕСТЧИНЫ В МЕЖВОЕННЫЙ ПЕРИОД (1921-1939 гг.)

Ковалева Н.Н.

*Брестский политехнический институт*

В конце XIX- начале XX века отведенная Бресту роль крупного железнодорожного узла, центра транзитной торговли и активное военное строительство на западных рубежах Российской империи стимулировали развитие промышленного производства в городе, формировали товарный характер земледелия и животноводства.

За годы I-й мировой войны Брест потерял почти половину жителей, было вывезено почти все, имеющее материальную ценность, разрушено 2500 зданий из 3670.

Произошедшее в 1921 году отделение западных районов Беларуси от БССР также пагубно отразилось на экономике этого региона. Брестчина вошла в состав польского государства, экономика которого находилась в состоянии экономического кризиса. В целях его преодоления польское правительство взяло значительные кредиты у западных государств, что повысило роль

иностранного капитала в экономике страны. Сдача в аренду итальянским капиталистам табачной монополии, а шведским – спичечной привела к тому, что в Бресте закрылось большинство предприятий этого профиля (при том, что в 60-е годы XIX века в Бресте было 5 табачных фабрик, имеющих по 200-300 рабочих).

При общем низком технико-экономическом уровне и наличии большого количества мелких и средних предприятий промышленность Польши характеризовалась относительно высокой степенью концентрации производства в отдельных отраслях: горнодобывающей, металлургической, текстильной. Металлообрабатывающая промышленность Брестчины не выдержала конкуренции со стороны польских предприятий, что привело к ее упадку.

Польша имела незначительный внешнеторговый оборот, причем ее главными экспортными товарами были ячмень, пшеница, продукция животноводства, лес. Проводимая польским правительством антисоветская политика, искусственно закрыла российский рынок. После 1921 года стратегическая роль Бреста, как центра транзитной торговли, была утрачена. Без российского рынка железнодорожный узел потерял свое значение, в связи с чем пришли в упадок отрасли, ориентированные на потребности железной дороги (производство смолы, поташа, стекла, железа из болотной руды) и на обслуживание пассажиров проходящих поездов ( производство табачных изделий, мыла, спичек).

Таким образом, польское правительство, отчасти по причине отсутствия инвестиции, но в большей степени потому, что экономика страны была ориентирована на западные государства, не стремилась развивать или поддерживать промышленность Брестчины. Теперь ставка делалась на вывоз сельскохозяйственной продукции и лесных богатств региона. Поэтому самыми крупными предприятиями в Бресте стали лесопильные заводы и полукустарные деревообрабатывающие предприятия, выпускающие часть продукции на экспорт.

Промышленность региона испытывала спады и подъемы, так как польская экономика развивалась циклично из-за общей экономической отсталости и зависимости от иностранного капитала. В период кризиса 1929-1932 гг. безработица в городе достигла катастрофического уровня ( в 1930 г. насчитывалось 9 тыс. человек безработных, при численности населения 37,7 тыс.). Численность жителей города увеличивалась медленно, так как даже при сильной аграрной перенаселенности близлежащих деревень, люди не очень стремились в Брест из-за невозможности устроиться на работу.

До вхождения в состав Польши сельское хозяйство Брестчины носило ярко выраженный товарный характер. Продукция земледелия и животноводства вывозилась в Россию, Польшу и западные страны. После 1921 года Польша продолжает вывозить отсюда мясо, сало, живую и битую птицу, а также картофель, причем преимущественно в непереработанном виде. Польские торговцы предпочитали сами приезжать на Полесье, чтобы закупить здесь скот и мясо по низким ценам. В Бресте работала только одна консервная фабрика.

Если в 90-е годы XIX века Брест занимал первое место в России по обороту в торговле крупным рогатым скотом, то в межвоеный период возможности сбыта сельскохозяйственной продукции на местных рынках значительно сократились.

После воссоединения Западной Беларуси с БССР Брест становился областным центром, что стимулирует рост его населения, промышленное и социальное развитие. Вокруг Бреста восстанавливается местный областной рынок, что связано с новым статусом города, строительством Брестского укрепрайона и размещением здесь значительных воинских формирований, реконструкцией Днепро-Бугского канала и возобновлением по нему движения.

## ДЗЕЙНАСЦЬ ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ НА НІВЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АСВЕТЫ


Гарбуль П.І.,Навіцкая І.М.

*Брэсцкі дзяржаўны універсітэт*


Сення, калі мы адзначаем 60-ю гадавіну уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, варта прыгадаць мужнае і самаахвярнае змаганне за нацыянальнае адраджэнне беларускага народа, якое вяло Таварыства беларускай школы (ТБШ). Гэта была самая уплывовая легальная, дэмакратычная, культурна-асветніцкая арганізацыя у Заходняй Беларусі, створаная 1 ліпеня 1921 г. у Вільні пад эгідай Беларускай цэнтральнай школьнай рады. Першапачаткова Таварыства мела права дзейнасці толькі на тэрыторыі Віленскага ваяводства. Але 27 красавіка 1926 г. быў прыняты новы статут Таварыства, у адпаведнасці з якім арганізацыя мела права пашыраць сваю дзейнасць на усю тэрыторыю польскай дзяржавы, а значыць і на Заходнюю Беларусь. Дзейнасць ТБШ пад уплывам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, Беларускай сялянска-рабочай грамады і сялянска-рабочага клуба «Змаганне» набыла масавы прагрэсіўны характар. Кіраўнікамі і актыўнымі дзеячамі арганізацыі ў розныя часы былі Б.Тарашкевіч, І.Дварчанін, П. Мятла, Р.Шырма, М.Танк, П.Пястрак, Н.Арсеннева і інш.

Асноўнай сваей мэтай Таварыства абвясціла пашырэнне асветы беларускага народа на яго роднай мове праз школьную сістэму і пазакласную работу, што было надзвычай актуальным у Заходняй Беларусі. Справа ў тым, што з моманту польскай акупацыі беларускія школы пачалі закрывацца ці пераводзіцца на полькую мову навучання. Так, з 514 беларускіх школ, што раней існавалі на далучанай у 1921 г. да Польшчы тэрыторыі, у 1922/1923 навучальным годзе дзейнічалі толькі 32. Паланізатарская палітыка улад у адносінах да беларускага насельніцтва выклікала неадабрэнне ў палітычных колах некаторых еўрапейскіх краін, бо яна супярэчыла канстытуцыі Польшчы, Рыжскаму мірнаму дагавору і Версальскаму пакту, якія гарантавалі нацыянальным меншасцям іх правы у карыстанні роднай мовай, арганізацыі уласных школ і развіцце сваей культуры. Гэта прымусіла польскі урад пайсці на некаторыя уступкі. 31 ліпеня 1924 г. сейм прыняў «Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцей», у адпаведнасці з якім